# ТЭМА 6.4. УЛАДЗІМІР ЛІПСКІ (УЛАДЗІМІР СЦЯПАНАВІЧ ЛІПСКІ) (1940)



Уладзімір Ліпскі – аўтар шматлікіх кніг для дзяцей і дарослых, старшыня праўлення Дзіцячага фонду Рэспублікі Беларусь, на працягу трыццаці сямі гадоў з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Вясёлка". У. Ліпскі адзначае: "*У нас тры асноўныя задачы: трэба навучыць дзяцей любіць сваю Радзіму; трэба прывіць ім любоў да роднай мовы, спадчыны, гісторыі, культуры; трэба, каб дзеці нашы ўмелі шанаваць людзей, якія цярпліва выводзяць іх на жыццёвыя пуцявіны*"[1].

---

[1] Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. : М.А. Маляўка, М.М. Чарняўскі. Мінск, 2007. С. 5.



ный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку

Дзённікі, апавяданні, казкі, прыгодніцкія аповесці, краязнаўчыя нарысы – багатая і разнастайная літаратурная спадчына, створаная для дзяцей У. Ліпскім. "*За мной рана зачыніліся дзверы дзяцінства. І я нібыта ўсё жыццё шукаю, уваходжу ў іх. Не магу нацешыцца светам Дзяцей. У дзверы Дзяцінства мяне ўводзілі: мая святая Мама, мае шоўкаўцы, класікі дзіцячай літаратуры Янка Маўр, Васіль Вітка, самі Дзеці. Я і сёння жыву ў Краіне Дзяцінства і пакутна-шчаслівы ад гэтага*"[1].

Нарадзіўся У. Ліпскі 6 чэрвеня 1940 г. у вёсцы Шоўкавічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Паводле слоў пісьменніка, яго бацькі выгадавалі шасцярых дзяцей, надзяліўшы іх чыстым сумленнем і жаданнем быць Чалавекам. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, фашысты дашчэнту спалілі родныя Шоўкавічы, давялося дзецям з маці хавацца ў лесе, жыць у зямлянцы, галадаць. Вайна адабрала ў будучага пісьменніка дзяцінства; з таго часу ён не можа бачыць слёзы дзяцей, іх боль, пакуты і, калі пасталеў, даў сабе слова заўсёды дапамагаць дзецям, аберагаць іх. Пазней жаданне гэтае спраўдзілася. Пасля заканчэння Мінскага тэхнікума харчовай прамысловасці У. Ліпскі працаваў на Гарадзейскім цукровым заводзе, у нясвіжскай раённай газеце. З 1976 па 1978 г. з'яўляўся адказным сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, а з 1978 г. стаў галоўным рэдактарам часопіса "Вясёлка". "*Цяпер, з вышыні ўзросту, мне здаецца: я ўсё жыццё працую для дзяцей. А чаму так атрымалася? Знаходжу адказ у тым, што свайго дзяцінства я па сутнасці і не меў. <...> Я, паверце, гляджу на свет дзіцячымі вачыма і цяпер, калі мне ўжо за семдзесят. Мне як бы хочацца вярнуцца ў Краіну дзяцінства* <...>",[2] – разважае У. Ліпскі.

У. Ліпскі – аўтар кніг для дзяцей "Рыгоркавы прыгоды" (1974), "Марынчына казка" (1977), "Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска" (1982), "Споведзь Шпундзіка" (1988), "Як Бог стварыў свет" (1993), "Вясёлая азбука" (1992), "Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка" (1992), "Антонік-Понік" (1998), "Каралева белых прынцэс" (2001), "Наша Маша" (2001),

[1] Буторына, І.А. Свой у краіне дзяцінства : сустрэчы з творамі Уладзіміра Ліпскага : вучэб.-метад. дапаможнік / І.А. Буторына. Мінск, 2010. С. 4.

[2] Ждановіч, І. Сонца ў спадчыну : гутарка з У. Ліпскім / І. Ждановіч // Беларусь. 2013. № 4. С. 39.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“Прыгоды Нуліка” (2007), “Я тут жыву” (2008), “Свіцязянская русалка” (2009), “Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу” (2009), “Азбука жыцця” (2010), “Вясёлка над Нёманам” (2011), “Сонца над галавой” (аповесць-ліставанне, пісьмы да ўнука, 2013), “Залаты домік” (казкі на рускай мове, 2013), “Сакрэты колераў вясёлкі” (2014).

Пісьменнік лёгка знаходзіць тэмы, займальныя сюжэты, сітуацыі, умее захапіць дзяцей цікавай і карыснай гульнёй, усхваляваць, зачараваць беларускім словам. Творы У. Ліпскага для дзяцей пазбаўлены залішняй павучальнасці, маралізатарства, пісьменнік размаўляе з юнымі чытачамі на даступнай, зразумелай ім мове.

Першая кніга — аповесць-казка для дзяцей “Рыгоркавы прыгоды” — выйшла ў 1974 г., перавыдадзена ў 2013 г. “*Рыгорка — хлопчык як хлопчык,* — паведамляе чытачам аўтар. — *Жыве ў горадзе. Ходзіць у дзіцячы сад. Умее маляваць. Любіць розныя прыгоды. Здараюцца часам з ім усялякія гісторыі. Хачу вам расказаць пра некаторыя Рыгоркавы прыгоды. Няхай хто пасмяецца, а хто і пра сябе падумае*”[1]. Пасля такой шчырай гаворкі-запрашэння паміж пісьменнікам і дзецьмі ўсталёўваецца атмасфера даверу і ўзаемаразумення, а Рыгорка становіцца блізкім сябрам, хлопчыкі і дзяўчынкі пазнаюць у ім сябе, прыгадваюць свае радасці, засмучэнні, адкрыцці.

З любоўю і даверам расказаў У. Ліпскі пра дзяўчынку Марынку, гераіню кнігі “Марынчына казка” (1977). Вобраз Марынкі збіральны, аб чым аўтар сведчыць у прадмове да кнігі: “*У нашым доме жывуць дзяўчынкі-смяшынкі. Сярод іх — некалькі Марынак. Адна з банцікам, другая з коскамі. <...> Я доўга назіраў за імі і напісаў пра іх апавяданні. Толькі не памятаю, якое апавяданне пра якую Марынку. <...> А можа, гэтыя гісторыі пра Марынку, якая жыве ў вашым доме?*”[2] У. Ліпскі вельмі назіральны творца, добра ведае псіхалогію дзяцей, таму так пераканаўча расказвае пра маленькую гераіню Марынку ў апавяданнях “Жывы тэлевізар”, “Гасцінец”, “Каму ўсміхалася Марынка”, “Медсястра”, “Цацкі”. Сааўтарамі падборкі

[1] Ліпскі, У. Пралескі ў небе : аповесці, апавяданні, казкі / У. Ліпскі. Мінск, 1997. С. 177.

[2] Тамсама. С. 193–194 .



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Незвычайныя ўрокі" з'яўляюцца самі хлопчыкі і дзяўчынкі, невыпадкова аўтар даў творам падзагаловак "Казкі, прыдуманыя дзецьмі".

Казачныя падзеі ў аповесці-казцы У. Ліпскага "Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска" (1982) цесна пераплятаюцца з паўсядзённасцю: "*Не за сінімі марамі, не за высокімі горамі, не на іншай планеце, а на нашай зямлі — у горадзе Дзіўнагорску — жыў хлопчык Янка. Быў ён белабрысы, рухавы, усім цікавіўся і вельмі сумаваў праз тое, што ў Дзіўнагорску не адбывалася ніякіх дзівосаў*"[1]. Але цуды сталі адбывацца, калі іх з'яўлення Янка менш за ўсё чакаў. Аднойчы, калі хлопчык застаўся адзін дома, узяў татаву туш і пачаў маляваць. Захапіўшыся, Янка не заўважыў, як па неасцярожнасці бутэлечку з тушшу перакуліў. Пасялілася ў сшытку Янкі вялізная клякса, якая стала, як ні дзіўна, жывой і сама прадставілася хлопчыку: "*А я Клякса-Вакса*". З гэтага моманту і пачаліся для Янкі незвычайныя прыгоды, пра якія марыў хлопчык: накіраваліся яны з Кляксай-Ваксай шукаць Пяцёрку, якая знікла са сшытка, сустрэліся з новымі знаёмымі, выправіліся ў падарожжа ў горад Казак і горад Лічбаў. Аўтар у аповесці-казцы нагадвае дзецям пра неабходнасць быць добразычлівымі, спагадлівымі, смелымі на шляху да перамогі дабра над злом, дапамагае дзецям спасцігнуць некаторыя сакрэты матэматыкі, вучыць іх стараннасці і настойлівасці ў авалоданні ведамі.

Прыгодніцкая аповесць "Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка" (1992) адрасавана дзецям малодшага школьнага ўзросту. Чорцік Дуронік — цацка Андрэйкі, якая згодна з асаблівасцямі казачнага жанру набывае рысы адушаўлёнай істоты: ператвараецца ў жывога, непаседлівага, гарэзлівага чорціка, які ўвесь час суправаджае свайго гаспадара Андрэйку. Разам з першакласнікам Андрэйкам дзеці даведваюцца пра тое, што хітрая каралева Лянота разбурыла замак Алфавіт. Лянота не любіць старанных, дапытлівых дзяцей, стварае перашкоды на шляху да ведаў. Андрэйка Добрык разам са сваімі новымі сябрамі Васем Вясёлкіным, Мурзілкам, Барвінкам і дзяўчынкай Алесяй пераадольваюць усе выпрабаванні ў барацьбе з Ля-

[1] Ліпскі, У. Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска / У. Ліпскі. Мінск, 1982. С. 4.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нотай, трапляюць на востраў Букварыю, разгадваюць тайну разбойнікаў, што разбурылі замак Алфавіт, і атрымліваюць перамогу.

Чытаючы аповесць, дзеці маюць магчымасць выконваць заданні разам з героямі твора. У. Ліпскі звяртае ўвагу на літару "Я" і значэнне адпаведнага слова "Я": "*Кожны з вас мае сваё імя, сваё «Я». — Давайце ўстановім Я на вяршыне замка. Няхай кожны, хто прыйдзе сюды, ведае: нялёгка ўзняцца да апошняй літары, да свайго «Я»*"[1], — вучыць У. Ліпскі і нібы падштурхоўвае дзяцей паразважаць над сэнсам выслоўя "ўзняцца да свайго «Я»" , працуючы над выхаваннем лепшых якасцей асобы[2].

Пісьменнік умела выкарыстоўвае элементы гульні ў казцы-забаўлянцы "Вясёлая азбука" (1992). Дзеці тут сустракаюцца з ўжо знаёмым ім героем Васем Вясёлкіным, які прапаноўвае прыдумаць на кожную літару вясёлую гісторыю ці казку. У кнізе шмат займальнага матэрыялу, які можа быць выкарыстаны ў якасці скорагаворак для выпрацоўкі правільнай дыкцыі.

Адметныя асаблівасці кніг апавяданняў-казак "Антонік-Понік" (1998) і забаўлянак і апавяданняў, быляў і небыліц, казак і загадак для Машы і ўсіх дзетак нашых "Наша Маша" (2001) — займальны сюжэт, гумарыстычны характар выкладання зместу, імкненне растлумачыць важнасць перамогі дабра над злом. Гэтыя кнігі спрыяюць фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі дзяцей, развіццю іх фантазіі і пазнавальнага інтарэсу, выхаванню добразычлівасці, лепшых маральных якасцей[3].

[1] Ліпскі, У. Пралескі ў небе... С. 326.

[2] Па матывах прыгодніцкай аповесці У. Ліпскага "Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка" ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры (да 2000 г. Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Беларусі) быў пастаўлены спектакль для дзяцей "Прыгоды ў замку Алфавіт" (музыка В. Войціка, лібрэта С. Клімковіч).

[3] У. Ліпскі знаходзіць патрэбныя словы, каб запрасіць дзяцей да размовы на самыя сур'ёзныя тэмы: Антонік даведваецца пра Чарнобыльскую аварыю, спрабуе выказаць свае адносіны да наступстваў бяды, складае "Чарнобыльскую казку", у якой імкнецца падказаць дарослым, як перамагчы гэтыя наступствы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У аповесці-казцы "Прыгоды Нуліка" (2007) У. Ліпскі распавядае пра сустрэчу Міколкі з Нулікам, іх прыгоды і гульні. Пісьменнік раскрывае тэму сяброўства, добразычлівых адносін паміж людзьмі, праўдзіва апісвае жыццёвую сітуацыю, якая магла б узнікнуць у жыцці кожнага дзіцяці: атрымаўшы ад бацькоў на дзень нараджэння прыстаўку да тэлевізара з электроннымі гульнямі, Міколка зусім забыўся пра свайго сябра. Кульмінацыяй твора з'яўляецца эпізод расстання Нуліка з Міколкам. Дзеці, якім адрасавана аповесць-казка, з хваляваннем сочаць за тым, як Міколка шукае Нуліка, радуюцца іх шчаслівай сустрэчы. Зразумелай юным чытачам мовай У. Ліпскі тлумачыць важнасць сяброўства ў жыцці людзей. Аповесць-казка "Прыгоды Нуліка" была высока ацэнена: яна прызнана лепшым творам дзіцячай літаратуры 2007 г.

У кнізе "Падкідыш" (1992) пісьменнік узняў голас у абарону дзяцей, прадоўжыў і ўзбагаціў гуманістычныя традыцыі айчыннай мастацкай літаратуры, якая на працягу ўсёй сваёй гісторыі не была абыякавай да іх лёсу (творы Я. Баршчэўскага, Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, К. Чорнага, Я. Маўра, А. Якімовіча, В. Віткі). Аднак не было твора, у якім бы пісьменнікі на поўны голас, дакументальна дакладнымі лічбамі, фактамі загаварылі пра пакуты дзяцей, пра іх сіроцтва (нярэдка пры жывых бацьках), пра крызіс сям'і, сямейнага выхавання. "*Хачу, каб паверылі: кнігу «Падкідыш» я не проста напісаў: кожную яе старонку перажыў сэрцам, выпакутаваў турботнымі днямі і бяссоннымі начамі*", — зазначае У. Ліпскі[1]. Глыбока кранаюць сэрцы чытачоў жудасныя прыклады, пра якія распавядаецца ў кнізе. Вадзіма Папова знайшлі ў лесе, ён, халодны і сплаканы, ляжаў у кустах, на выгляд меў чатыры месяцы... Марата Чарнова заўважылі ў Калінкавічах у пад'ездзе аднаго з дамоў. Валодзю Трыбелустава міліцыя знайшла ў Гомелі на станцыі, на выгляд яму было месяцаў сем-восем..."*О, неба, дапамажы разабрацца. Дзікі звер і той не кідае сваё дзіця. Кожная травінка-былінка імкнецца нарадзіць сабе падобную. А чалавек? Разумнейшая істота на зямлі, што вытварае? Тым больш — сама маці. Ёй жа прырода*

[1] Ліпскі, У. Падкідыш / У. Ліпскі. Мінск, 1992. С. 5.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*адвяла найгалоўнейшую ролю – нараджаць дзяцей, прадаўжаць род чалавечы* <...>"[1], – узрушана разважае аўтар.

Праблемы дзяцінства і сям'і знаходзяцца ў цэнтры ўвагі У. Ліпскага ў кнізе "Бацькі і дзеці" (1995, 2002; аўтарскае вызначэнне жанру кнігі – дзённікі)[2]. Аўтар згадвае жудасныя сваёй непрыдуманасцю гісторыі: маці забівае толькі што народжанае дзіця, бацька гвалціць малую дачку, падлетак – вясковую бабулю... І ніякага апраўдання няма таму, хто ўчыніў падобныя злачынствы. У кнізе "Бацькі і дзеці" – крык душы, заклік берагчы дзяцей, аптымістычная вера пісьменніка ў тое, што ўсё можна змяніць да лепшага. У. Ліпскі верыць: "*Жыве дабрыня, жыве міласэрнасць сярод людзей*"[3]. Пра чулых людзей, якія, нібы родных, даглядаюць дзяцей у інтэрнатах, дамах сямейнага тыпу, пісьменнік гаворыць з павагай і ўдзячнасцю: "*Парадуемся: сярод нас жывуць закаханыя бацькі, прыродны талент якіх – любіць дзяцей*"[4]. Немагчыма без душэўнага болю чытаць раздзелы кнігі "Пакуль жывуць буслы", "Ачысцім нашы душы", "У імя Айца, Сына і Святога духа", якія ўяўляюць сабой своеасаблівы чарнобыльскі рэпартаж, што з'явіўся ў выніку паездкі пісьменніка па забруджаных мясцінах Гомельшчыны. Чарнобыль спарадзіў "*цяжкія і бязлітасныя хваробы, якія пазбавілі дзяцей дзяцінства, будучыні, хваробы нашага грамадства, не менш страшныя за калецтва, бо тое калецтва душэўнае. Яно гоніць дзяцей і падлеткаў у злачыннасць, жорсткасць, жабрацкасць*"[5].

У дакументальнай аповесці "Адпяванне жывых" (1993) створаны праўдзівы летапіс роднай вёскі У. Ліпскага – Шоўкавічы. Яшчэ ў аповесцях "Замасцянцы" і "Лаўрэнавы працадні" адчувалася, што пісьменнік распавядае пра родную вёску.

[1] Тамсама. С. 81.

[2] Кніга складаецца з сямі раздзелаў: "Шукай сябе", "Дай, Божа, дзецям долю", "Пакуль жывуць буслы", "Ачысцім нашы душы", "У імя Айца, Сына і Святога Духа", "Вясёлка надзеі", "Снег на галаве", якія нагадваюць завершаныя творы.

[3] Ліпскі, У. Бацькі і дзеці / У. Ліпскі. Мінск, 2002. С. 192.

[4] Тамсама. С. 145.

[5] Жук, А. Што падказвае душа / А. Жук // Ліпскі, У. "Не выжываю, а жыву!.." : дапаможнік / аўт.-укл. М. Яфімава. Мінск, 2005. С. 118.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У творы "Адпяванне жывых" яна пададзена буйным планам і пад сваёй сапраўднай назвай. Аўтар захоўвае імёны, прозвішчы, мянушкі людзей, назвы суседніх вёсак, навакольных бароў, урочышчаў, рэчак, гістарычных мясцін. Пісьменнік засяроджвае ўвагу на тых пераломных гістарычных падзеях, калі, здавалася, не выжыць ні вёсцы, ні вяскоўцам: калектывізацыя, рэпрэсіі 1930-х гг., Вялікая Айчынная вайна, пасляваеннае разбурэнне... І колькі разоў адпявалі іх! Адсюль і назва аповесці "Адпяванне жывых". Твор вучыць любіць родную зямлю, свой народ, аберагае падлеткаў ад духоўнага збяднення, прагматызму, дае адчуванне радасці і гордасці за магчымасць быць на зямлі Чалавекам. Пісьменнік перакананы : "*<...> дзе б чалавек ні аказаўся, кім бы ні працаваў, чаго б ні дасягнуў, яго магнітам цягне ў сваю родную мясціну. Тут яго карані. Абарві іх, паруш грыбніцу, і звяне чалавек, дзе б ні быў прапісаны*"[1].

Кнігу "Мама. Малітва сына" (1999)[2] У. Ліпскі напісаў да стагоддзя сваёй Маці, Марыі Адамаўны, беларускай вясковай жанчыны, ласкавай і мудрай. Яе вобраз узнесены пісьменнікам на п'едэстал Багіні. Кніга задумана як споведзь, як малітва, таму мае падзагаловак "Малітва сына". Паэзіяй дабрыні прасякнуты ўспаміны сына пра Маму, нястомную руплівіцу. "*Божа, яна слугавала нам дзень і ноч, бо гэта было яе жыццё. Яна адчувала, што яе прызванне — быць Мамай. Яна ўсіх сваіх дзяцей навучыла любіць зямлю і людзей, і гэта стала яе галоўным урокам маралі*"[3].

Кніга "Мама. Малітва сына" не толькі знаёміць з лёсам аднаго чалавека, а дапамагае спазнаць філасофію мацярынства, прыгажосць беларускай жанчыны-працаўніцы, Маці, зразумець мудрасць і веліч маралі, ідэалаў нашага народа; усё гэта дасягаецца на ўрадлівай нацыянальнай глебе, з выкарыстаннем адметна беларускіх дэталяў штодзённага народнага

[1] Ліпскі, У. Адпяванне жывых / У. Ліпскі. Мінск, 1993. С. 161.

[2] За дакументальныя аповесці "Мама. Малітва сына", "Бацька. Пісьмы сына", а таксама за шматгадовае служэнне дзіцячай літаратуры і дзяцінству У. Ліпскі адзначаны Літаратурнай прэміяй імя Аляксандра Грына.

[3] Ліпскі, У. Мама. Малітва сына / У. Ліпскі. Мінск, 1999. С. 118.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

побыту, працы, свят, з апяваннем родных краявідаў. У. Ліпскі з цеплынёй успамінае, як ішоў упершыню ў школу, як яны з мамай малацілі пранікамі жыта, як Маці, амаль непісьменная вясковая жанчына, нібы мудры педагог, вяла свайго сына да эстэтычнага пазнання прыроды. Аднойчы яна пабудзіла яго на досвітку і, заінтрыгаваўшы паказаць "*нештачка*", павяла сына праз прыгуменне на сенажаць. Тым "*нештачкам*" быў узыход сонца! Гэты эпізод поўніцца зачараванай узрушанасцю здзіўлення, хараством, багаццем зрокавых эфектаў, танальных адценняў, адухоўленасцю. Усё перадаецца праз успрыманне хлопчыка з паэтычнай душою: "*Мне падалося ў той міг, — прыгадвае аўтар, — што я зараз убачу не проста вогненны шар, а нейкага таямнічага светлага чалавека-веліканa... О, цуд!*"[1]. Праз усё жыццё нясе пісьменнік у памяці тую шоўкаўскую раніцу і той незвычайны, незабыўны падарунак ад Мамы. Да яе звяртаецца, з ёю, як з жывой, гаворыць, дзеліцца сваімі клопатамі.

У цэнтры аповесці У. Ліпскага "Бацька. Пісьмы сына" (2004) — бацька пісьменніка Сцяпан Іванавіч Ліпскі, псіхалагічную сутнасць якога тонка адчувае сын. Сын піша пісьмы бацьку, якога даўно ўжо няма ў жывых, спавядаецца, раіцца. У адрозненне ад Маці, Бацька сваёй прыязнасці да дзяцей знешне не выяўляў: лічыў, што кабраслі яны прыстойнымі, іх трэба трымаць у строгасці. Дзеці ніколі не адважваліся прытуліцца да яго, сказаць ласкавае "Татачка". З горыччу У. Ліпскі адзначае: "*Чаму цяпер, калі цябе даўно няма ў гэтым жыцці, хочацца прылашчыцца да тваёй непаголенай шчакі? Чаму хочацца шкадаваць цябе, аддзячыць табе?*"[2]. Чытача прываблівае шчырасць, цеплыня аўтарскага аповеду. Пісьменнік закранае ў аповесці і тэму гістарычнай памяці. Бацька пісьменніка ваяваў у гады Першай сусветнай вайны, быў партызанскім сувязным у час Вялікай Айчыннай. Увогуле з апошняй вайны ў вёску Шоўкавічы не вярнуліся дваццаць шэсць чалавек, і пісьменнік згадвае імя і прозвішча кожнага з іх, бо лічыць, што "*іх забываць — грахоўнасць недаравальная.* <...>"[3]. "*Помніце!*" — *Вось мой*

[1] Тамсама. С. 59.

[2] Ліпскі, У. Бацька. Пісьмы сына / У. Ліпскі. Мінск, 2004. С. 4.

[3] Тамсама. С. 95.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*наказ маладым,* – папярэджвае У. Ліпскі, – *бо калі парвецца ланцужок памяці, забудуцца мёртвыя і памруць жывыя*"[1].

У. Ліпскі першым у айчыннай літаратуры расказаў пра свой радавод. Кніга "Я. Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод" (1998)[2], створаная на аснове архіўных і дакументальных матэрыялаў, – своеасаблівае падарожжа ў часе, між асоб і лёсаў. У. Ліпскі, як заўважыў А. Вярцінскі, "*выступае і як пісьменнік-публіцыст, і як гісторык-архівіст, і як даследчык-гербазнаўца, і... як прапаведнік*"[3]. Змест аповесці немагчыма пераказаць сваімі словамі. У кнізе даследуецца радавод роду Ліпскіх, распавядаецца пра шматлікія падзеі (ахоп у часе – сем стагоддзяў), прыведзена шмат гістарычных дат, фактаў, геаграфічных назваў, прозвішчаў. Родавыя сувязі вядуць у іншыя краіны свету: Польшчу, Расію, Літву, Германію, Канаду, Злучаныя Штаты Амерыкі. Чалавек павінен усведамляць сувязь пакаленняў, мусіць ведаць сваё радаводнае дрэва, сваю сямейную планету, бо "*без гэтага мы сіроты, абрубкі, проста пні*"[4]. Пісьменнік выкарыстоўвае мастацкую асацыяцыю: сямейны радавод – радаводнае дрэва і схему, якая пацвярджае такое падабенства. У. Ліпскі імкнецца, каб чытач усвядоміў сутнасць "Я" як "*галоўнай фігуры, стрыжня, вакол якога адбываюцца ўсе падзеі*"[5].

У. Ліпскі ў аповесці канкрэтызуе само паняцце "сям'я", адзначае, што традыцыйнае разуменне сям'і як ячэйкі грамадства спрошчанае, бо "*не ўлічваецца пры гэтым, што ў сям'і ўвасоблены генная энергія продкаў, стагоддзямі назапашаныя скарбы культуры, звычак, традыцый, характараў*"[6]. Сям'я – "*гэта планета-ракета, якая выносіць на арбіту новых і новых прадаўжальнікаў роду.* <...> *Дзеці – спадарожнікі планеты Сям'я. На ёй яны напаўняюцца мудрасцю, сілай, жыццёвым за-*

[1] Тамсама. С. 93.

[2] У 2010 г. кніга выдадзена пад новай назвай "Усе мы – радня".

[3] Вярцінскі, А. "Ліпскія, радніцеся!", або род плюс род – народ... / А. Вярцінскі // Ліпскі, У. "Не выжываю, а жыву!..". Мінск, 2005. С. 121.

[4] Ліпскі, У. Усе мы – радня : аповесць, апавяданні / У. Ліпскі. Мінск, 1998. С. 10.

[5] Тамсама. С. 8.

[6] Яфімава, М. Што раблю? Жыццё люблю! / М. Яфімава // Ліпскі, У. "Не выжываю, а жыву!..". Мінск, 2005. С. 35.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*радам. І, адчуўшы моц у крылах, з дапамогай бацькоў узлятаюць на сваю арбіту* <...>"[1]. Пісьменнік прыводзіць формулу Сям'і: Я (ён) + Я (яна) = сям'я. Сям'я + сям'я = род. Род + род = = народ. Народ + народ = людзі Зямлі. Нягледзячы на тое, што кожны народ мае сваю адметную культуру, гісторыю, звычаі, сваю зямлю, мы ўсе знаходзімся ў адной лодцы: "*народ плюс народ – людзі Зямлі*". Усё гэта неабходна захоўваць і берагчы, таму ў пасляслоўі да кнігі У. Ліпскі звяртаецца з просьбай да Бога: "*Не рабі, Усявышні, чалавека манкуртам, які не памятае, не ведае, хто ён, ад каго паходзіць і каму абавязаны сваім жыццём*"[2].

У аповесці "Я. Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод", як заўважыла М. Яфімава, "*выявіліся даследчыцкія здольнасці пісьменніка, які зрабіў сапраўдныя адкрыцці, што ўзбагацілі беларускае літаратуразнаўства. Маюцца на ўвазе, напрыклад, новыя звесткі пра вытокі, гісторыю стварэння і прататыпаў камедыі-вадэвіля В. Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта», паэмы «Халімон на каранацыі»*"[3].

Сталася так, што ўзнаўленне гісторыі роду Ліпскіх вылілася ў аповед пра род кожнага з нас, пра наш, беларускі народ ("Род плюс род – народ").

Кніга "Я тут жыву" (2008) пачынае краязнаўча-дакументальны цыкл твораў, у якіх пісьменнік запрашае дзяцей да цікавага падарожжа па родным краі[4].

"Азбука жыцця" (2010) – своеасаблівы аўтарскі энцыклапедычны слоўнік, які знаёміць дзяцей з паняццямі і тэрмінамі, размешчанымі ў алфавітным парадку. Пісьменнік звяртаецца да маленькіх чытачоў з заклікам любіць родны край, вывучаць мінулае сваёй краіны, ганарыцца яе дасягненнямі, любіць і шанаваць сям'ю, быць неабыякавымі да свайго здароўя, расці чулымі і добразычлівым людзьмі.

[1] Ліпскі, У. Усе мы – радня... С. 10.

[2] Тамсама. С. 270.

[3] Яфімава, М. Верны сябра дзяцей / М. Яфімава // Азбука жыцця : кн. для дзяцей / У. Ліпскі. Мінск, 2010. С. 202.

[4] Кнігі краязнаўчых нарысаў "Свіцязянская русалка" (2009), "Вясёлка над Нёманам" (2011) знаёмяць дзяцей з адметнымі мясцінамі Гродзенскай і Гомельскай абласцей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кніга “Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу” (2009) з першых старонак адсылае ў далёкае дзяцінства Паэта; яна здзіўляе, цікавіць, бо напісана надзвычай кранальна, душэўна. У. Ліпскі разважае над сэнсам жыцця, сцвярджае, што няма нічога даражэйшага за людзей, якія ўзгадавалі цябе, вучылі, благаслаўлялі. У кнігу ўключаны ўрыўкі з твораў Янкі Купалы, якія дазваляюць чытачу пачуць жывое слова паэта, лепш зразумець асобныя матывы яго творчасці.

Апавяданні, казкі, аповесці, дзённікі, нарысы У. Ліпскага, створаныя для дзяцей, вызначаюцца жывой народнай мовай, дасціпнасцю, займальнасцю, веданнем дзіцячай псіхалогіі, дапамагаюць умацоўваць сямейныя адносіны, берагчы непаўторныя ўспаміны дзяцінства і юнацтва, абараняць душэўны спакой дзяцей.

“*Як галоўны рэдактар «Вясёлкі» я мару, каб усміхаліся нашы дзеці, каб яны раслі ў павазе да роднай мовы, традыцый сям'і, каб усёй сваёй працай нам і далей пракладваць сцяжынку да сэрца кожнага маленькага беларуса, а ён каб выхоўваўся ў любові і дабрыні і ганарыўся Радзімай. Вось тады я буду шчаслівы як чалавек, як рэдактар і як пісьменнік,*” – адзначае У. Ліпскі[1]. Пісьменнік тлумачыць дзецям, што кожны дзень жыцця – гэта непаўторнае свята. Жыццёвы аптымізм пісьменніка дапамагае зразумець: “Жыццё – гэта дар. Жыццё – гэта свята”. Такая жыццесцвярджальная думка пульсуе ва ўсіх творах У. Ліпскага – таленавітага пісьменніка, лаўрэата літаратурных прэмій імя Янкі Маўра (1993), Васіля Віткі (1997), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2001), Міжнароднай прэміі А. Швейцара за дабрачынныя справы на карысць дзяцей (1998), уладальніка ордэна святога Дзімітрыя “За справы міласэрнасці”, які ўручаў пісьменніку Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II, спецыяльнай узнагароды “За асабісты ўклад у развіццё дзіцячай прэсы” па выніках XI Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ “Залатая Ліцера” (2015) – чалавека, якога па праве можна лічыць сваім у шчырай краіне Дзяцінства.

[1] Падліпская, З. Чалавечае і пісьменніцкае шчасце Уладзіміра Ліпскага : інтэрв'ю / З. Падліпская // Роднае слова. 2012. № 4. С. 6.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Пытанні і заданні

1. Якія тэмы і праблемы хвалююць У. Ліпскага – пісьменніка і галоўнага рэдактара часопісаў для дзяцей "Вясёлка" і "Буся" – на сучасным этапе?

2. Адзначце жанравую разнастайнасць твораў У. Ліпскага для малодшых школьнікаў. Адказ падмацуйце пэўнымі прыкладамі.

3. Складзіце крыжаванку для дзіцячага конкурсу на лепшага знаўцу казачных аповесцей "Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка", "Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска", "Вясёлая азбука". У якасці прыкладу выкарыстоўвайце крыжаванкі, змешчаныя ў кнізе І.А. Буторынай "Свой у краіне дзяцінства".

4. Падрыхтуйце сцэнарый выхаваўчага мерапрыемства ў форме падарожжа па старонках кніг У. Ліпскага альбо электронную прэзентацыю кніг пісьменніка "Мама. Малітва сына", "Бацька. Пісьмы сына" (заданне можна выконваць калектыўна).

## Літаратура

### Асноўная

1. Буторына, І.А. Свой у краіне дзяцінства : сустрэчы з творамі Уладзіміра Ліпскага : вучэб.-метад. дапаможнік / І.А. Буторына. Мінск, 2010.

2. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. : М.А. Маляўка, М.М. Чарняўскі. Мінск, 2007.

3. Ждановіч, І. Сонца ў спадчыну : гутарка з У. Ліпскім / І. Ждановіч // Беларусь. 2013. № 4. С. 39.

4. Ліпскі, У. Адпяванне жывых : аповесць пра адну вёску; дзённік / У. Ліпскі. Мінск, 1993.

5. Ліпскі, У. Азбука жыцця : кніга для дзяцей / У. Ліпскі. Мінск, 2010.

6. Ліпскі, У. "Не выжываю, а жыву!.." : дапаможнік / аўтар-уклад. М. Яфімава. Мінск, 2005.

7. Ліпскі, У. Бацька. Пісьмы сына / У. Ліпскі. Мінск, 2004.

8. Ліпскі, У. Бацькі і дзеці : дзённікі / У. Ліпскі. Мінск, 2002.

9. Ліпскі, У. Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска : казкі / У. Ліпскі. Мінск, 1982.

10. Ліпскі, У. Мама. Малітва сына / У. Ліпскі. Мінск, 1999.

11. Ліпскі, У. Падкідыш: нарысы, публіцыстыка, дзённік / У. Ліпскі. Мінск, 1992.

12. Ліпскі, У. Пралескі ў небе. Аповесці, апавяданні, казкі / У. Ліпскі. Мінск, 1997.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

13. Ліпскі, У. Прыгоды нуліка : аповесць-казка / У. Ліпскі Мінск, 2007.

14. Ліпскі, У. Рыгоркавы прыгоды / У. Ліпскі. Мінск, 1974.

15. Ліпскі, У. Я. Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод : аповесць / У. Ліпскі. Мінск, 1998.

16. Ліпскі, У. Я тут жыву : дзецям пра Беларусь / У. Ліпскі. Мінск, 2008.

17. Ліпскі, У. Я. Усе мы радня : аповесць, апавяданні / У. Ліпскі. Мінск, 1998.

18. Ліпскі, У. Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу / У. Ліпскі. Мінск, 2009.

19. Падліпская, З. Чалавечае і пісьменніцкае шчасце Уладзіміра Ліпскага : інтэрв'ю / З. Падліпская // Роднае слова. 2012. № 4. С. 4–6.

**Дадатковая**

1. Камейша, К. Вярнуцца ў вясну : пра жыццё і дзейнасць У. Ліпскага / К. Камейша // Маладосць. 2000. № 5. С. 241–245.

2. Марціновіч, А. Святло чароўнага ліхтарыка : выбран. старонкі гісторыі белар. дзіцячай літаратуры : дапаможнік. У 2 кн. Кн. 2 / А. Марціновіч. Мінск, 1998. С. 191–197.

3. Уладзімір Ліпскі : жыццё і творчасць / уклад. А.В. Радзікевіч. Мінск, 2015.

4. Уладзімір Ліпскі: «Не выжываю, а жыву!..» : дапаможнік / аўтар-уклад. М. Яфімава. Мінск, 2005.

5. Яфімава, М.Б. Слова – краска, слова – ззянне... : дапаможнік / М.Б. Яфімава. Мінск, 2000.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова